МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

МОГИЛЕВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

# РАШЭННЕ

# РЕШЕНИЕ

25 жніўня 2020 г. № 5-189

г. Магілёў

г. Могилев

Аб наданні статусу і катэгорыі
гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе падпункта 1.1 пункта 1 і часткі першай пункта 7 артыкула 93, падпункта 4.1 пункта 4 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЎ:

1. Надаць матэрыяльным культурным каштоўнасцям статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю «3» згодна з дадаткам.

2. Упраўленню культуры Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта сумесна з Асіповіцкім і Крычаўскім раённымі выканаўчымі камітэтамі ва ўстаноўленым парадку прыняць меры па рэалізацыі дадзенага рашэння.

Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта — Л.К.Заяц

Для документов

Кіраўнік спраў
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта — М.Л.Дзядкоў

Дадатак
да рашэння
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
25.08.2020 № 5-189

ПЕРАЛІК
матэрыяльных культурных каштоўнасцей, якім надаецца статус і катэгорыя гісторыка-культурнай каштоўнасці

| Назва | Месца знаходжання | Катэгорыя | Датаванне | Дата і нумар рашэння абласнога савета па пытанням гісторыка-культурнай спадчыны |
|---|---|---|---|---|
| Рухомая матэрыяльная культурная каштоўнасць | | | | |
| 1. 122-мм палявая гаўбіца ўзору 1910/30 гадоў з зараднай скрыняй для буксіравання гарматы | г. Асіповічы, мемарыяльны комплекс «Алея Герояў» | 3 | 1910-1930 гады | ад 11.08.2020 № 2 |
| Нерухомыя матэрыяльныя культурныя каштоўнасці | | | | |
| 2. Гарадзішча «Замкавая гара» | г. Крычаў, па вул. Сожавай на правым беразе р. Сож (60 м), у 0,2 км на паўночны захад ад вусця ручая, які праходзіць з заходняга боку горада, у 0,8 км на поўдзень ад гарадзішча «Гарадзец» | 3 | сярэдзіна XII стагоддзя | ад 11.08.2020 № 2 |
| 3. Гарадзішча «Гарадзец» | г. Крычаў, па вул. Камсамольскай на левым беразе ручая Крычавец, правага прытоку р. Сож, у 0,5 км вышэй вусця, у 20 м на захад ад вул. Ленінскай, у 0,6 км на поўдзень ад шашы Рослаўль-Чэрыкаў | 3 | IX-XII стагоддзі | ад 11.08.2020 № 2 |

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

МОГИЛЕВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

# РАШЭННЕ

# РЕШЕНИЕ

23 кастрычніка 2020 г. № 6-56

г. Магілёў

г. Могилев

Аб змяненні рашэння Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта ад 25 жніўня 2020 г. № 5-189

На падставе пункта 1 артыкула 40 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 108-З "О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь" Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЎ:

Унесці ў дадатак да рашэння Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта ад 25 жніўня 2020 г. № 5-189 "Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці" наступныя змяненні:

у пункце 1:

графу "Месца знаходжання" пасля слова "Герояў" дапоўніць словамі "вул. Сташкевіча";

у графе "Датаванне" словы "1910–1930 гады" замяніць словамі "1930–1941-я гады";

у графе "Месца знаходжання" пункта 2 словы "г. Крычаў, па вул. Сожавай на правым беразе р. Сож (60 м), у 0,2 км на паўночны захад ад вусця ручая, які праходзіць з заходняга боку горада, у 0,8 км на поўдзень ад гарадзішча "Гарадзец" замяніць словамі "г. Крычаў, вул. Сожавая, на правым беразе р. Сож, 60 м ад р. Сож, 0,2 км на паўночны захад ад вусця ручая Ставок, 0,8 км на поўдзень ад гарадзішча "Гарадзец";

у графе "Месца знаходжання" пункта 3 словы "г. Крычаў, па вул. Камсамольскай на левым беразе ручая Крычавец, правага прытоку р. Сож, у 0,5 км вышэй вусця, у 20 м на захад ад вул. Ленінскай, у 0,6 км на поўдзень ад шашы Рослаўль-Чэрыкаў" замяніць словамі "г. Крычаў, вул. Камсамольская, на левым беразе ракі Крычаўкі, 0,5 км вышэй вусця ракі Крычаўкі, 20 м на захад ад вул. Ленінскай, 0,6 км на поўдзень ад

УПКП «МОУТ», з. 3524, т. 6000

аўтадарогі Р-43 “Мяжа Расійскай Федэрацыі (Звянчатка)–Крычаў–Бабруйск–Івацэвічы (да аўтамабільнай дарогі Р-2/Е 85)”.

Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта Л.К.Заяц

Кіраўнік спраў
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта М.Л.Дзядкоў